Вяселле – справа сур’ёзная!

(У рамках падрыхтоўкі фальклорна-тэатральнага прадстаўлення “Вілейскае вяселле”)

Класная гадзіна для вучняў 11 класа

Складальнік: Матусевіч Таццяна Пятроўна,
намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры

Мэта: выхаванне поларолевай культуры і падрыхтоўка падлеткаў да сямейнага жыцця.

Задачы: пазнаёміць вучняў з хрысціянскімі прынцыпамі і народнымі традыцыямі сямейных узаемаадносін; развіваць мысленне і мову, уменні разважаць і выказваць свае меркаванні; выхоўваць павагу да сямейнага ўкладу жыцця, высокія маральныя якасці, заснаваныя на хрысціянскім светапоглядзе.

Абсталяванне: запісы на дошцы (тэма класнай гадзіны, выказванні Святога апостала Паўла, з Евангелля ад Лукі); лісты паперы і ручкі для запісаў азначэння кахання і для рэфлексіі, сметніца, рукзак; карткі для вучняў з правіламі калектыўнай працы, выказваннямі, прыказкамі, урыўкамі з народных вясельных песень “Татачка, родненькі…” і “Пайду я замуж ды даведаюся...”.

Ход класнай гадзіны

1. Аргмомант: прывітанне настаўніка з вучнямі *(мэтазгодна выкарыстаць традыцыйныя формы народных прывітанняў)*, эмацыянальная настройка вучняў на працу на ўроку.

Настаўнік: Добры дзень, дарагія вучні.

Вучні: – Добры дзень добрым людзям!

– Добрага вам здароўя!

– Няхай Бог дае добрае!

– Шчаслівага вам дня!

– З мірам прымаем, дабра жадаем!

Настаўнік: І я таксама жадаю вам дабра і поспехаў. Маю надзею, што мы плённа і цікава папрацуем. Запрашаю ўсіх да ўдзелу ва ўроку і хачу яшчэ раз напомніць правілы эфектыўнай калектыўнай працы: кожнае меркаванне мае права на існаванне, прытрымліваемся правіла трох “не” (не бурчаць пад нос, не шаптаць на вуха, не гаварыць адначасова), актыўна ўдзельнічаць у працы і абмеркаваннях.

2. Абмеркаванне тэмы і задач урока

А) Абвяшчэнне тэмы і задач урока (вучням прапаноўваецца зачытаць тэму ўрока, запісаную на дошцы, выказаць свае меркаванні на конт яе).

Б) Настаўнік абагульняе сказанае вучнямі.

Настаўнік: Актуальная і своечасовая гутарка, мне здаецца, у нас павінна сёння адбыцца. Вы, маладыя людзі, з кожным годам прыбліжаецеся да таго моманту, калі самім настане час ладзіць уласныя сем’і, уступаць у шлюб. Многія народныя звычаі будаваліся і будуюцца на аснове маральных прынцыпаў хрысціянства. Зразумела, што на іх асноўваюцца і народныя спрадвечныя правілы пабудовы сям’і і ўзаемаадносін ў ёй. Пад час класнай гадзіны мы разгледзім узаемасувязь хрысціянскіх прынцыпаў і народных традыцый ва ўзаемаадносінах паміж мужам і жонкай. Паспрабуем зразумець, на колькі вяселле – справа сур’ёзная.

3. Актыўная пазнавальная дзейнасць вучняў

А) Праца над зместам гумарэскі “Яны сустрэліся…” *(тры падрыхтаваныя вучні чытаюць гумарэску па ролях, настаўнік прапаноўвае астатнім вучням паразважаць на конт убачанага і пачутага).*

Яны сустрэліся, у момант закахаліся,

Пабеглі ў ЗАГС і тут жа распісаліся.

Ён увесь гарэў, яна цвіла, як мак,

І шчабяталі маладыя так:

- Ты лапачка мая…
- А ты мой пончык…
- А ты мой сімпампончык…
- А ты мая мардашка…
- А ты мая дурашка!..

Так шчабяталі галубкі не дзень, не два,
а цэлых тры дзянькі!
А потым бразнуў п’яны сімпампончык
У сімпацюльку пляшку і вазончык.
А сімпацюлька жвавая была,
Яго баршчом гарачым абліла…
Цяпер вучоныя гавораць так:
“Заканамернасць веку – пробны брак!”

Пытанні і заданні настаўніка для гутаркі з вучнямі:

– Як вам спадабаліся такія ўзаемаадносіны паміж мужам і жонкай? Ці жадалі б сабе такога “шчасця”?

– Аўтар гумарэскі гаворыць “яны сустрэліся, у момант закахаліся…” Закахаліся, але ці пакахалі (палюбілі) адзін аднаго?

– На лістах паперы, што ляжаць на вашых партах, запішыце, калі ласка, сваё азначэнне слова “каханне”. *(Вучням даецца на працу 3-5 хвілін, потым яны зачытваюць, калі пажадаюць, напісанае, абмяркоўваюць).*

– У пасланні Святога апостала Паўла да Карынфянаў пра любоў гаворыцца наступнае *(вучні зачытваюць напісанае на дошцы)*: “Любоў доўгацярплівая, літасцівая, любоў не зайздросціць, любоў не ўзвышаецца, не ганарыцца, любоў не бясчынствуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не думае злога, не радуецца няпраўдзе, а радуецца ісціне; усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё зносіць” [Кар.13:4]. Зыходзячы з гэтага выказвання скажыце, чаго не хапіла пары з гумарэскі для таго, каб зарадзілася і развілося сапраўднае каханне?

Настаўнік абагульняе выказванні вучняў:

У тым жа пасланні Святога апостала Паўла сказана *(вучні зачытваюць напісанае на дошцы)*: “Жонка не ўладарыць над сваім целам, а муж, аднолькава і муж не ўладарыць над сваім целам, а жонка [Кар.7:4]. Як вы зарумееце гэта выказванне? (Муж і жонка – адно цэлае, непадзельнае). Прыкладна па такім прынцыпе і будаваліся ўзаемаадносіны паміж мужам і жонкай у большасці сем’яў нашых прадзедаў. Жонка, забудзь пра сябе, а думай пра мужа і дзяцей, а муж пра сябе меней дбай, а больш пра жонку і дзяцей. Менавіта таму шлюбы і былі трывалымі.

Б) Вучням прапаноўваецца праслухаць запісы 2-3 вясельных песень (“Татачка, родненькі…” і інш.)

Пытанні настаўніка:

– Як думаеце, чаму на традыцыйных народных вяселлях было многа сумных спеваў, нечым нават падобных да галашэнняў?

– Давайце прыгадаем хаця б некалькі радкоў песні “Татачка, родненькі…” *(вучні зачытваюць з картак)*. Як разумееце сэнс радкоў гэтай песні?

Татачка, родненькі, перайдзі мора,
Татачка, родненькі, выкупі з гора,
Дачушка, мілая, я не перайду,
Дачушка, мілая, я цябе не выкуплю…

В) Праца над зместам гумарэскі “Дакарала на вяселлі бабка маладую…” *(падрыхтаваныя вучні інсцэніруюць гумарэску)*.

Дакарала на вяселлі бабка маладую:
– Ой, не так сябе паводзіш
Ты, як пагляджу я!
Як выходзіла я замуж,
Дык не рагатала,

А ўсё плакала ў застоллі,
Слёзы пралівала…
Маладая на бабулю глянула бяспечна:
– Не бядуйце, я ж выходжу замуж не навечна!..

Гутарка настаўніка з вучнямі:

– Вось і адказ на запытанне пра сумныя спевы на вяселлі. Чаму маладой весела? *(Бо яна замуж ідзе “не навечна”, у яе “пробны брак”, а бабка ў свой час ішла замуж на ўсё жыццё, на самаахвярнае служэнне іншым (мужу, дзецям) і карпатлівую працу над сабой).*

– Як вы ставіцеся да “пробных бракаў”?

– А на колькі сур’ёзна ўспрымаўся шлюб, адназначна сведчаць нам многія вясельныя песні, што вучылі раней маладых: пасля вяселля зваротнай дарогі няма *(вучні зачытваюць радкі з народнай песні “Пайду я замуж ды даведаюся…”).*

Народныя прыказкі таксама сведчаць пра сур’ёзныя адносіны да шлюбу *(вучні зачытваюць прыказкі)*: “Не паглядай на чужых жонак: ці скасееш, ці здурнееш”, “Не дай, доля, два разы жаніцца”, “Жонка не рукавіца, з белай ручкі не скінеш, за пояс не заткнеш”.

У Евангеллі ад Лукі гаворыцца так *(вучні зачытваюць з дошкі)*: “Усякі, хто разводзіцца з жонкаю сваёю і жэніцца з другой – пралюбадзейнічае [грашыць, дапускае блуд, здраджвае каханню]; і ўсякі, хто жэніцца на разведзенай з мужам, пралюбадзейнічае” [Лк.16:18]. Па хрысціянскіх запаветах пралюбадзейства – адзін з найвялікшых грахоў.

4. Заключная частка ўрока

А) Слова настаўніка:

Спадзяюся, што вы атрымалі пэўную інфармацыю для далейшых разважанняў. А працягнуць нашу гутарку пра ўзаемасувязь хрысціянскіх прынцыпаў і народных традыцый у пабудове сямейных узаемаадносін мы зможам на наступных занятках. Абмяркуем мэты старажытнага народнага

абраду “Пасад”, таінства вянчання, прынцыпы ўзаемаадносін ў сям’і паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі.

Дзякуй вам за плённую працу. Мне прыемна было бачыць вашы дапытлівыя твары.

Б) Рэфлексія “Сметніца і рукзак”

Вучням, зыходзячы з пачутага на класнай гадзіне, прапаноўваецца на адным лісце паперы запісаць тое, што б яны хацелі ўзяць у сваю будучую сям’ю для яе шчасця, а на другім – што б яны хацелі выкінуць з сям’і. Адну паперку яны выкідваюць у сметніцу, а другую кладуць у рукзак.

В) Развітанне.

Настаўнік: Паспрабуем на развітанне сказаць шчырыя пажаданні адзін аднаму.

Вучні: – Усяго вам найлепшага!

– Нашы паненкі маладыя, пасаг збірайце і долю майце!

– Панічам нашым маладым жадаем расці, весяліцца, ды ў свой час ажаніцца!

– Хай Бог усім дае добрае!

Настаўнік: Я таксама жадаю ўсім поспехаў і шчасця! Да пабачэння!